*УДК 1(091)(476)«192»*

# АПРОЧ АБДЗІРАЛОВІЧА: ХАРАКТАРЫСТЫКА ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ ІГНАТА КАНЧЭЎСКАГА

***І. М. НОВІК*** [1*]

[1*]*Інстытут філасофіі НАН Беларусі, вул. Сурганава, 1, корп. 2, 220072, г. Мінск, Беларусь*

Даследуецца жыццё і творчасць Ігната Канчэўскага, больш вядомага айчыннаму чытачу пад псеўданімам Ігнат Абдзіраловіч, – аўтара знакамітага эсэ «Адвечным шляхам». Разгледжаны асноўныя вехі кароткага, але плённага жыцця беларускага мысляра: адукацыя, удзел ва ўкраінскім нацыянальным руху, праца на адміністрацыйных пасадах як у Савецкай Беларусі, так і ў Сярэдняй Літве, яго кола знаёмстваў, цікавасць да ўсходняй філасофіі і, у прыватнасці, да ёгі. Таксама даецца характарыстыка іншым тэкстам, апроч слыннага эсэ «Адвечным шляхам», якія належаць пяру І. Канчэўскага. Спадчына мысляра ўключае ў сябе дзесяць надрукаваных пры яго жыцці публіцыстычных твораў, пераважная большасць якіх прысвечана тэме кааператыўнага руху; чатыры вершы, дасланыя ім самім у беларускія газеты, і яшчэ адзін верш, надрукаваны ў год смерці аўтара ў зборніку «Заходняя Беларусь». Акрамя таго, захаваліся яшчэ тры рукапісы: два – у аддзеле рукапісаў НАН Беларусі («Эскізы будучыні» – чарнавік эсэ «Адвечным шляхам» і «Накідкі думак аб выкладанні ў школе асноў кааперацыі») і адзін – у аддзеле рукапісаў Акадэміі навук Літвы (сшытак з вершамі І. Канчэўскага). Асноўны вывад нашага даследавання наступны: галоўнай, амаль што адзінай, тэмай творчасці Канчэўскага-публіцыста была кааперацыя: вакол яе раіліся яго думкі, да яе ён звяртаўся зноў і зноў, яе бараніў і аналізаваў, яе абрысы шукаў у іншых культурных і сацыяльных з'явах беларускага жыцця. З кааперацыяй была звязана большая частка яго біяграфіі і практычнага жыцця. Таму яе з'яўленне на старонках эсэ «Адвечным шляхам» зусім не выпадковае: акурат на гэтыя пару старонак прыходзіцца асноўны цяжар палітычнай філасофіі І. Канчэўскага, у іх неабходна шукаць ключ да яго сацыяльнай ідэалогіі.

***Ключавыя словы:*** Ігнат Канчэўскі; Ігнат Абдзіраловіч; гісторыя беларускай філасофіі.

# ПОМИМО АБДИРАЛОВИЧА: ХАРАКТЕРИСТИКА ЖИЗНИ И ТВОРЧЕСТВА ИГНАТА КОНЧЕВСКОГО

***И. М. НОВИК*** [1)]

[1)]*Институт философии НАН Беларуси, ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, г. Минск, Беларусь*

Исследуется жизнь и творчество Игната Кончевского, более известного читателю под псевдонимом Игнат Абдиралович, – автора знаменитого эссе «Извечным путем». Рассмотрены основные вехи короткой, но плодотворной жизни белорусского мыслителя: образование, участие в украинском национальном движении, работа на административных должностях как в Советской Беларуси, так и в Срединной Литве, его круг знакомств, интерес к восточной философии и, в частности, к йоге. Также дана характеристика другим, помимо известного эссе «Извечным путем», текстам, принадлежащим перу И. Кончевского. Наследие мыслителя включает десять напечатанных при его жизни публицистических произведений, среди которых подавляющее большинство посвящено теме кооперативного движения; четыре стихотворения, присланных им самим в белорусские газеты; еще одно стихотворение, напечатанное в год смерти автора в сборнике «Западная Беларусь». Кроме того, сохранились три рукописи: две – в отделе рукописей НАН Беларуси («Эскизы будущего» – черновик эссе «Извечным путем» и «Наброски мыслей о преподавании в школе

**Образец цитирования:**
Новік ІМ. Апроч Абдзіраловіча: характарыстыка жыцця і творчасці Ігната Канчэўскага. *Журнал Белорусского государственного университета. Философия. Психология.* 2019;2:15–22.

**For citation:**
Novik IM. Besides Abdziralovič: characteristic of the life and work of Ihnat Kančeŭski. *Journal of the Belarusian State University. Philosophy and Psychology.* 2019;2:15–22. Belarusian.

**Автор:**
***Иван Михайлович Новик*** – младший научный сотрудник центра историко-философских и компаративных исследований.

**Author:**
***Ivan M. Novik***, junior researcher at the center for history of philosophy and comparative studies.
*novik.jan@gmail.com*

основ кооперации») и одна – в отделе рукописей Академии наук Литвы (тетрадь со стихами И. Кончевского). Основной вывод нашего исследования следующий: главной, едва ли не единственной, темой Кончевского-публициста была кооперация: вокруг нее вращались его мысли, к ней он обращается снова и снова, ее защищает и анализирует, ее очертания ищет в других культурных и социальных явлениях белорусской жизни. С кооперацией же была связана и существенная часть его биографии и практической жизни. Поэтому ее появление на страницах эссе «Извечным путем» совсем не случайно: как раз на этих нескольких страницах наиболее рельефно выявлены основы политической философии И. Кончевского и в них необходимо искать ключ к пониманию его социальной идеологии.

***Ключевые слова:*** Игнат Кончевский; Игнат Абдиралович; история белорусской философии.

# BESIDES ABDZIRALOVIČ: CHARACTERISTIC OF THE LIFE AND WORK OF IHNAT KANČEŬSKI

***I. M. NOVIK*** [a]

[a]*Institute of Philosophy, National Academy of Sciences of Belarus, 1 Surhanava Street, 2 building, Minsk 220072, Belarus*

The article deals with the life and works of Ihnat Kančeŭski, better known under the pseudonym Ihnat Abdziralovič, the author of the famous essay «Advečnym šliaham» («Eternal way»). The article reviews the main milestones of the short but productive life of the Belarusian thinker – education, participation in the Ukrainian national movement, work in administrative positions in the Soviet Belarus and Central Lithuania, his circle of acquaintances, and interest in Eastern philosophy, in particular, in yoga. In addition, the article provides a description of other text written by Kančeŭski: publicistic texts printed during his lifetime, majority of which dedicated to the topic of the cooperative movement, verses and three manuscripts: two in the department of manuscripts of the National Academy of Sciences of Belarus («Eskizy budučyni» is a draft of the «Advečnym šliaham» and «Nakidki dumak ab vykladanni ŭ školie asnoŭ kaaperacyi»), and one in the department of manuscripts of the Lithuanian Academy of Sciences. It is a notebook with verses. Our main conclusion is as follows: the main, almost the only topic of Kančeŭski as publicist was cooperation. This topic was riveted on his attention, to it he returned again and again, through the framework of cooperation he analyzed other cultural and social phenomena of the Belarusian life. A significant part of his biography and practical life was associated with cooperation. Therefore, its appearance in the pages of «Advečnym šliaham» is not a coincidence. Just these few pages bear the brunt of political philosophy of Kančeŭski, here one should look for the key to understanding of his social outlook.

***Keywords:*** Ihnat Kančeŭski; Ihnat Abdziralovič; history of Belarusian philosophy.

У сённяшняй беларускай філасофіі Ігнат Канчэўскі іграе ролю нязнанага знаёмцы: усе ведаюць яго як Ігната Абдзіраловіча – аўтара эсэ «Адвечным шляхам». Для бадай што любой рэфлексіі над беларускай гісторыяй і культурай добрым тонам лічыцца зрабіць спасылку ці дапоўніць уласны тэкст цытатай са слыннага эсэ. Але далёка не ўсе згадаюць сапраўднае прозвішча аўтара гэтага твора. Яшчэ менш тых, хто можа пахваліцца веданнем акалічнасцей жыцця і лёсу віленскага філосафа. Трэба прызнаць: Ігнат Канчэўскі ўсё яшчэ чакае свайго руплівага і спагадлівага бібліёграфа. У «Адвечным шляхам» чытаем: «Душа чалавечая, што прыходзіць у свет падзівіцца з яго хараства, што прыходзіць адзін раз у свет, ні да каго не падобная і адзіная на сваім шляху…»[1] [1, с. 28], «чалавечая душа – такая ж капелька, іграючая кветкамі косаў. Трэба ж не сціскаць, не хаваць футлярамі гэтай ігры, трэба даць поўную магчымасць зіхацець нялічаным багаццем фарбаў» [1, с. 25].

Сам аўтар гэтых радкоў, мы перакананы, быў такой душой-кропляй, ні да каго не падобнай кропляй, у якой адбілася ўсё багацце падзей і культурных кантэкстаў першых дзесяцігоддзяў мінулага стагоддзя. Згодны з намі і Антон Луцкевіч (які, магчыма, натхняўся пры напісанні некралога І. Канчэўскаму тымі ж радкамі): «Быццам дыямент цудоўны, дзіўным хараством гарэла Яго душа сярод жыццёвага бруду, маны, крывадушнасці» [2, с. 1].

Задача нашага даследавання – вывучэнне хутчэй «біяграфіі ідэй», чым канкрэтных асоб, таму пакінем толькі некалькі цікавых фактаў і згадак для падмацавання нашага (і А. Луцкевіча) выказвання ў надзеі натхніць чытача на далейшыя пошукі.

**Адукацыя І. Канчэўскага.** Скончыў Віленскую рэальную вучэльню, паступіў у тэхналагічны інстытут у Санкт-Пецярбургу, але, расчараваўшыся ў дакладных навуках, спачатку перавёўся на прыродазнаўчы, а пасля – на гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага ўніверсітэта [2, с. 1; 3, с. 77]. Паводле звестак У. Калесніка, скончыў апошні, атрымаўшы спецыяльнасць настаўніка літаратуры [4, с. 140]. Ужо ў час Першай сусветнай вайны І. Канчэўскі прайшоў вышэйшыя кааператыўныя курсы пры Народным універсітэце імя А. Шаняўскага [2, с. 1]. Гэты ўніверсітэт быў эксперымен-

[1]Тут і далей цытаты прыводзяцца з захаваннем лексічных асаблівасцей арыгінала. – *І. Н.*

тальным. Яго стварылі на грошы і паводле тэстаменту А. Шаняўскага – сібірскага золатапрамыслоўцы, установа мусіла быць адчыненай для ўсіх незалежна ад полу, веравызнання і палітычных поглядаў. Пры паступленні не патрабавалася ніякіх атэстатаў і дакументаў, апроч асабістага пасведчання. Не было абавязковай праграмы, студэнты маглі самі абіраць патрэбныя для сябе курсы, апроч таго, студэнцтву былі нададзены дастаткова значныя паўнамоцтвы ў кіраванні ўніверсітэтам (гл. [5; 6]). Адным словам, ужо тут можна ўбачыць першае сутыкненне І. Канчэўскага з увасабленнем сацыяльных ідэалаў вольнай, нязмушанай супольнасці-кааперацыі. Пры гэтым, нягледзячы на эксперыментальны характар універсітэта, у якасці выкладчыкаў у ім быў сабраны свет тагачаснай рускай навукі. Пакуль няма звестак, якія з курсаў наведваў І. Канчэўскі, таму нельга сказаць, каго з мэтраў ён мог пачуць, але ў адным можна быць упэўненымі: абраўшы ва ўніверсітэце спецыялізацыяй кааперацыю, ён не мог не пазнаёміцца з думкамі А. В. Чаянава [6, с. 530] – выбітнага і найбольш вядомага як тады, так і зараз тэарэтыка і практыка рускага кааператыўнага руху (гл. [7–11]).

**Дачыненне да ўкраінскага нацыянальнага руху.** Падчас вайны І. Канчэўскі, як афіцэр 44-га ўкраінскага палка Румынскага фронту, агітаваў салдат, абапіраючыся на праграму сацыял-рэвалюцыянераў. Удзельнічаў у стварэнні нацыянальнага ўкраінскага войска і быў абраны салдатамі на пасаду афіцэра ўжо новай арміі [2, с. 1; 12, с. 24].

**Праца на адміністрацыйных і асветніцкіх пасадах у савецкіх установах, звязаных з кааперацыяй.** Па сканчэнні курсаў у Народным універсітэце імя А. Шаняўскага І. Канчэўскі займаў пасаду інструктара Цэнтральнага саюза льнаводаў [2, с. 1; 3, с. 77], пасля быў накіраваны ў Сычоўскае таварыства кааператараў [13, с. 23]. Адразу па абвяшчэнні ССРБ ён едзе ў Менск, дзе працуе інструктарам Саўнаргаса [2, с. 1; 3, с. 77]. У лістападзе 1919 г. І. Канчэўскі займаў пасаду кіраўніка інструктарскага аддзела Беларускага цэнтральнага саюза спажывецкіх таварыстваў [14, с. 23]. Таму, калі на старонках «Адвечным шляхам» сустракаем дастаткова скептычнае стаўленне да практыкі савецкага будаўніцтва, то гэтыя радкі трэба разглядаць не як плён аўтарскай уявы, страх перад новым і невядомым, але як падрахунак хоць і сціплага, але рэальнага жыццёвага досведу. Відаць, акурат расчараванне ў камуністычным праекце прывяло І. Канчэўскага ў 1919 г. у Вільню, з якой звязаны апошнія гады кароткага жыцця беларускага філосафа.

**Удзел у культурным і палітычным жыцці Віленшчыны.** Апроч удзелу ў віленскім кааператыўным руху, І. Канчэўскі выкладаў у Беларускай гімназіі кааператыўныя курсы, там жа вёў геаграфічны гурток і стварыў вучнёўскі кааператыў [2, с. 1]. Згодна са звесткамі У. Конана, філосаф прымаў удзел у дзейнасці Беларускага навуковага таварыства [15, с. 36]. Паводле бюлетэня Цэнтральнай рады Віленшчыны і Гродзеншчыны № 1 ад 18 верасня 1919 г., быў абраны ў раду як прадстаўнік ад Саюза кааператываў [16, с. 33]. Яго імя таксама фігуруе і сярод кандыдатаў ад вёскі Дукшты Свянцянскага павета ў польскі Сейм у выбарах за 1922 г. [16 с. 34].

**Шырокае кола знаёмстваў сярод заходнебеларускай нацыянальнай інтэлігенцыі.** Акрамя відавочных сувязей з А. Луцкевічам (цытаваны некралог напісаны А. Луцкевічам з пазіцыі добрага знаёмага, апроч таго, хутчэй за ўсё менавіта яму належыць рукапіс вершаў І. Канчэўскага, знойдзены ў фондзе рукапіснага аддзела бібліятэкі Акадэміі навук Літвы), ёсць сведчанні і пра іншыя стасункі з прадстаўнікамі заходнебеларускай інтэлігенцыі. У. Калеснік апісвае яго як сябру Уладзіміра Жылкі («Жылка, як і Родзевіч, уваходзіў у кола блізкіх да Ігната Канчэўскага людзей» [4, с. 78]; «Ігнат Канчэўскі асабіста ведаў тагачасных паэтаў-рамантыкаў – Леапольда Родзевіча і Уладзіміра Жылку» [3, с. 141]) і нават знаходзіць у вершах апошняга ўплывы эсэ «Адвечным шляхам» [4, с. 79] (пытанне патрабуе далейшых даследаванняў, бо аргументацыя У. Калесніка небездакорная). Са «Споведзі» Л. Геніюш мы даведваемся, што Б. Тарашкевіч не толькі асабіста ведаў І. Канчэўскага, але нават даверыў яму такую небяспечную справу, як перасылка нелегальных эмігрантаў у Літву: «Яначку [мужа Л. Геніюш] Тарашкевіч направіў да нейкага Канчэўскага ў Дукштах, беларускага кааператара, які па ланцужку так перасылаў людзей. З Канчэўскім яны прагаварылі ноч напралёт, быў гэта ідэйны і вельмі разумны беларус, аднак ехаць старым шляхам было нельга, нехта ўжо данёс пра яго, і Канчэўскі направіў Янку “на вока” назад, але каб ён вылез на першай станцыі і направіўся да харошага літоўскага ксяндза, да якога даў сваяго ліста» [17, с. 16].

**Знаёмства з камуністычным рухам на Віленшчыне.** Асобна варта згадаць лёс сям’і Канчэўскіх. Бацька, спачатку сакратар Вайскова-акруговага суда, прымае сан праваслаўнага святара. Ігнат хіба не найбольш паслядоўна і глыбока сярод заходнебеларускіх публіцыстаў бароніць ідэю адметнага і мірнага шляху беларусаў, які мусіць праходзіць праз роўнааддаленую паміж камунізмам і капіталізмам і не быць прадвызначаным ніякімі палітычнымі ідэалагемамі. Родны ж брат І. Канчэўскага – Арсен – спачатку стварае з аднадумцамі Беларускую рэвалюцыйную арганізацыю і абірае шлях узброенага супраціўлення польскім уладам, а пасля далучаецца да камуністычнага руху: з 1923 г. становіцца членам ЦК КПЗБ, з 1929 г. – членам Бюро ЦК КПЗБ [18, с. 184]. Ідэалагічнае раздарожжа, якое на-

паткала сям'ю Канчэўскіх, можна параўнаць хіба што з вядомым прыкладам братоў Іваноўскіх, адзін з якіх стаў палякам, другі – літоўцам, трэці – беларусам (гл. [19]). У той жа час ёсць звесткі, што ў перакідцы і ўладкаванні ў Вільні савецкай агентуры апасродкаваны ўдзел прымала ўся сям'я Канчэўскіх [20, с. 53–54].

**Дасведчанасць у ёзе, тэасофіі, усходняй культуры.** Дагэтуль непасрэдна не пацверджаныя, але вельмі цікавыя згадкі пра І. Канчэўскага як арганізатара ці то тэасафічнага гуртка «для вывучэння поглядаў індыйскіх ёгаў на замагільнае жыццё» [3, с. 110], ці то гуртка ўласна ёгі [12, с. 24.]. Прынамсі, маем у якасці сведчанняў наступны допіс на сшытку яго вершаў, які захоўваўся ў аддзеле рукапісаў Акадэміі навук Літвы: «Тэосафы лічаць І. К. як чалавека прайшоўшага вышэйшае духовае развіццё – "яснавідзячым"» [16, с. 37], а таксама ліст, знойдзены ў аддзеле рукапісаў: «Пасылаю ў выдавецтва дзіўную, асабліва натхнёную паэзію Ігната Канчэўскага. Тут кожны радок дыхае абноўленай тэасофіяй. Што ні слова – развага з душой, духам, будучыняй. А ўся гэтая вязанка настроевых рыфмаваных думак – гімн для надыходзячай, новай пасле матэрыялістычнай эпохі чалавецтва» [16, с. 39]. Апроч таго, сярод паэтычнай спадчыны І. Канчэўскага знаходзім верш «На матывы Р. Тагора» [21, с. 2] і згадку таго ж самага Р. Тагора як «вялікага сучаснага прарока» ў водгуку на вершы Л. Родзевіча [22, с. 4].

Апошні, магчыма самы істотны, штрых да партрэта нашага нязнанага знаёмцы: І. Канчэўскі – аўтар не толькі эсэ «Адвечным шляхам», якім уяўляе яго абсалютная большасць чытачоў і інтэрпрэтатараў. Апроч гэтай брашуры, вядомыя каля тузіна яго газетных артыкулаў, тузін вершаў і тры рукапісы: а) знойдзены А. Бяляцкім у аддзеле рукапісаў Акадэміі навук Літвы сшытак з вершамі, перапісанымі кімсьці са знаёмых, відаць А. Луцкевічам, на карысць чаго кажа падабенства почырку і надпіс на ўнутраным баку вокладкі: «Jerzy Łuckiewicz» (што дазваляе дапусціць, што сшытак належаў роднаму сыну Антона – Юрыю Луцкевічу) [16, с. 39], частка вершаў надрукавана ў [23]; б) «Эскізы будучыні» (чарнавік эсэ «Адвечным шляхам») [24]; в) «Накідкі думак аб выкладанні ў школе асноў кааперацыі» (абодва апошнія тэксты належаць руцэ самога І. Канчэўскага і знаходзяцца ў аддзеле рукапісаў НАН Беларусі) [25]. Магчыма, гэтых твораў не так шмат, але і нямала для няпоўных чатырох гадоў побыту ў Вільні, частку з якіх І. Канчэўскі яшчэ і цяжка хварэў (паводле прызнання яго самога, «апынуўся ў дрэнным, амаль што не безнадзейным становішчы на зіму 20–21 г.» [26, с. 5]). Апроч таго, збор спадчыны мысляра нельга лічыць скончаным: існуе магчымасць з'яўлення звестак пра іншыя тэксты яго аўтарства, як з віленскага перыяду жыцця, так і ранніх, умоўна кажучы, «савецкіх» і «перадрэвалюцыйных» тэкстаў.

Магчыма, астатнія творы Канчэўскага і не адзначаны той глыбінёй і размахам думкі, як эсэ «Адвечным шляхам», але відавочна, што менавіта яны складаюць той непасрэдны кантэкст, які дапаможа нам глыбей зразумець знакаміты твор. Знаёмства з гэтым кантэкстам дапамагло б пазбегнуць некаторых памылак у інтэрпрэтацыі эсэ, напрыклад, погляду, што тут мае месца «містыфікацыя» [27], быццам сам І. Канчэўскі не мог напісаць такі твор.

Пяройдзем да характарыстыкі творчай спадчыны мысляра.

Першым на старонках віленскай перыёдыкі з'яўляецца ліст І. Канчэўскага ў рэдакцыю «Нашай думкі» [26]. З яго мы даведваемся пра біяграфічныя абставіны: «Захварэўшы ўлетку 1920 г. на туберкулёз плюцаў (лёгкіх. – *І. Н.*), я апынуўся ў дрэнным, бадай што не безнадзейным становішчы на зіму 20–21 г., дзякуючы несур'ёзнаму лячэнню прыватных лекараў і немагчымасці атрымаць праўдзівую медыцынскую помач» [26, с. 5]. Але ўзяцца за напісанне гэтага ліста беларускага мысляра вымусіла зусім не жаданне паскардзіцца на цяжкасці асабістага жыцця, а шчырая ўдзячнасць, жаданне дагадзіць прынамсі словам. З кіпцюроў смерці яго вырвала дапамога з боку «Мішмэрэс-Хойлім» – прыватнага дабрачыннага яўрэйскага шпіталя, у якім не зважылі нават на не яўрэйскае паходжанне І. Канчэўскага [6]. Схільны да рэфлексіі і філасофскага абагульнення, з сваіх прыватных абставін ён робіць выснову: «У данным выпадку можна ўбачыць толькі чын сумленнай чалавечнасці, якая, нягледзячы на паходжэнне, ідзе на помач усім, страціўшым сілу, а не ў імя асабістай або групавой карысці, а для самага чалавека, у імя чалавечнасці.

Чалавечнасць адносін паміж асобнымі адзінкамі – неабходная падстава згоды агулу. Толькі тады, калі наша грамадзянства, пасечанае на варажыя рэлігійныя, нацыянальныя і класавыя лагеры, уцяміць гэтую простую праўду і пачне паважаць не групавы адзнак, а чалавечую сутнасць, тады магчыма запраўднае, а не толькі ў праектах і на словах, паразуменне паміж штучна падзеленымі грамадзянскімі групамі» [26].

Ужо ў гэтых радках – фактычна першых вядомых нам уласных словах І. Канчэўскага – можна разглядзець той сацыяльна-палітычны і маральны ідэал, які натхніць мысляра на напісанне эсэ «Адвечным шляхам» і ўвасаблення якога ён будзе шукаць у кааператыўным руху:

а) недавер да вонкавых азначэнняў і катэгорый, паводле якіх дзеляць грамадства;

б) супрацьпастаўленне ім плёну нізавой самаарганізацыі і непасрэдных грамадскіх ініцыятыў;

в) чалавечнасць і чалавек як апошнія і невытворныя каштоўнасці асабістага і грамадскага жыцця. Толькі паводле ідэалу вызвалення чалавека і ўласна чалавечага ў ім можа ацэньвацца гістарычны і сацыяльны прагрэс (згадаем вельмі вымоўнае апісанне А. Луцкевіча: «У кожным выяўленні Яго працы перш за ўсё відаць было гарачае ўмілаванне чалавека. І чалавека хацеў Ён вызваліць у беларусе» [2, с. 1]);

г) чалавечая пакута як стымул да неадкладнага дзеяння: відовішча страціўшых сілу патрабуе адказу без прамаруджання, тут і зараз, у канкрэтнай чыннасці спагады.

Зрэшты, такое супадзенне думак не павінна здзіўляць. На рукапісе «Эскізы будучыні» чытаем: «Пачата 4, IV, 21» і «Скончана 12, V, 21» [24]. Ліст жа датаваны 4 траўня 1921 г., такім чынам, І. Канчэўскі напісаў яго, ужо амаль маючы перад сабой гатовы тэкст «Адвечным шляхам». Сам твор неўзабаве пачынае выходзіць асобнымі ўрыўкамі ў газеце «Наша думка» ў нумарах за чэрвень – ліпень 1921 г. [28–33]. Нарэшце, у канцы года выходзіць артыкул «П.П.С. і “unarodowienie” польскага гандлю» [34].

У 1922 г. пабачылі свет наступныя артыкулы (у парадку з’яўлення): «Ратуйце каапэрацыю!» [35], рэцэнзія на зборнік «Маладая Беларусь» [36], «Пашырэнне каапэратыўнага закону на Віленшчыну» [37], «Крэдытовая каапэрацыя» [38], «На каапэратыўныя тэмы» [39], «Каапэрацыя ў 1922 годзе» [40]. Напрыканцы гэтага ж года І. Канчэўскі ўпершыню друкуе верш «Gloria – Слава ў вышніх» [41], падпісаны «Ганна Галубянка» (у тэксце пазначана, што гэта пераклад «З. З. Вайнароўскай» [41, с. 4], але звестак аб такой паэтэсе мы не знайшлі).

Наступны 1923 г. І. Канчэўскі пачынае з водгуку на зборнік вершаў Л. Родзевіча «Беларусь» [22] і яшчэ аднаго ўласнага, зноў падпісанага «Ганна Галубянка» верша – ужо згаданага намі твора «На матывы Р. Тагора» [21]. У гэты ж год у беларускай перыёдыцы пад тым жа псеўданімам будуць надрукаваны яшчэ два вершы: «Верасьнёвае пано» [42] і «У святочны дзень» [43]. Апошні выйдзе ўжо пасля смерці беларускага мысляра. Апроч таго, апошнім годам жыцця І. Канчэўскага датуецца артыкул «Закладайма народныя выдавецтвы!» [44]. Хоць каапэрацыя і не фігуруе ў назве тэксту, яго ўсё ж варта аднесці акурат да каапэратыўнай тэматыкі. Менавіта ў досведзе сельскагаспадарчай і спажывецкай каапэрацыі І. Канчэўскі знаходзіць, як яму здаецца, вырашэнне праблемы беларускай выдавецкай справы. «Беларускае друкаванае слова не мае дагэтуль запэўненага жыцця таму, што пад ім няма моцнай матэрыяльнай падставы» [44], таму яно існуе з ласкі адзінак і залежыць ад волі адміністрацыйных улад. Між тым газетная праца прынцыпова не адрозніваецца ад усякай іншай гаспадарчай і гандлёвай справы, хіба што ўкладзеныя ў яе грошы вяртаюцца больш павольна [44]. Гэты больш павольны абарот капіталу і патрэба ў буйной стартавай суме для заснавання выдавецтва нібы змушае думаць, што справа па кішэні хіба што «…капіталістым. А тут гістарычныя абставіны злажыліся так, што мы не маем сваей уласнай буржуазіі» [44]. У гэты момант Канчэўскі, які пакуль што разважаў нібы ашчадны эканамістгаспадарнік, паказвае свой сапраўдны твар: «Калі так, дык сам народ павінен збудаваць здаровыя гаспадарчыя падставы для свайго друкаванага слова… <…> …Кожны беларус, які любіць і чытае сваё роднае друкаванае слова і хоча, каб справы народнай асветы пасуваліся далей, мусіць даць сваю часць для стварэння народнага выдавецкага капіталу, мусіць уступіць у сябры выдавецкага каапэратыва» [44]. На культурныя справы І. Канчэўскі глядзіць праз прызму каапэрацыі. Але ж сама каапэрацыя, якую мы схільныя ўспрымаць выключна ў эканамічных тэрмінах, асэнсоўваецца ім праз этычныя і нацыянальныя пытанні. Мысленне І. Канчэўскага належыць іншай дыскурсіўнай канстэляцыі, чым наша: яму яшчэ невядомы раскол паміж эканамічным і гуманітарным дыскурсамі.

Нарэшце, да спадчыны І. Канчэўскага варта дадаць яшчэ тэксты, надрукаваныя пасмяротна ў зборніку «Заходняя Беларусь»: верш прозай «Мы разам» [45], артыкул «З мінуўшчыны каапэрацыі ў Віленшчыне» [46] і тры згаданыя вышэй рукапісы. Адносна названага артыкула ўкладальнікі зборніка заўважаюць: «Гэты нарыс – першая частка шырэйшае працы, задуманае перадчасна памершым аўтарам, выдатным каапертыўным дзеячом. Смерць перашкодзіла Ігнату Канчэўскаму давясці, як планаваў, свае нарысы да нашых дзён» [46, с. 141]. Такім чынам, з гэтых слоў даведваемся: І. Канчэўскі выношваў планы напісання гістарычнага аналізу краёвага каапэратыўнага руху ад першых дзён да актуальных яму часоў. З рукапісу ж «Накідкі думак аб выкладанні ў школе асноў каапэрацыі» можна зрабіць выснову, што яшчэ адным няскончаным планам мысляра было стварэнне і імплементацыя праграмы школьнага курса па каапэрацыі.

Галоўная выснова з праведзенага даследавання жыцця і творчасці І. Канчэўскага наступная: асноўнай, бадай што не адзінай, тэмай Канчэўскагапубліцыста была каапэрацыя. Да яе ўвесь час звяртаецца ў думках, праз яе формы спрабуе аналізаваць палітычнае і культурнае жыццё беларусаў. Таму і тыя некалькі старонак эсэ «Адвечным шляхам», што прысвечаны тэме каапэрацыі [1, с. 40–41], варта разглядаць як галоўнае выяўленне сацыяльнапалітычных поглядаў беларускага мысляра: «Пэўна, што праўдзівы жыццёвы кірунак – той, якім ідзе каапэрацыя» [1, с. 41].

Таму для больш грунтоўнага аналізу і разумення адметнасцей сацыяльна-палітычных поглядаў І. Канчэўскага неабходнымі і эўрыстычнымі мы

лічым, па-першае, разгляд яго ідэй і меркаванняў як на фоне беларускага каапeратыўнага руху ў Сярэдняй Літве і міжваеннай Польшчы ў цэлым, так і ў шырокім кантэксце сувязей паміж каапeратыўным рухам і нацыянальным будаўніцтвам у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе; па-другое, аналіз уплыву ўдзелу ў беларускай кааперацыі на фармуляванне агульнай філасофскай пазіцыі ў эсэ «Адвечным шляхам». У прыватнасці, адным з найбольш цікавых і шматабяцальных напрамкаў для далейшага вывучэння жыцця і творчасці І. Канчэўскага ўяўляецца нам параўнанне яго філасофіі з пазіцыяй вядомага польскага ідэолага каапeратыўнага руху Эдварда Абрамоўскага.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Абдзіраловіч І. [Канчэўскі ІУ]. *Адвечным шляхам. Дасьледзіны беларускага сьветагляду.* Мінск: Навука і тэхніка; 1993. 44 с.
2. АЛ. [Луцкевіч А]. Памяці Ігната Канчэўскага. *Новае жыцьцё.* 1923;9:1.
3. Калеснік УА. *Ветразі Адысея: Уладзімір Жылка і рамантычная традыцыя ў беларускай паэзіі.* Мінск: Мастацкая літаратура; 1977. 325 с.
4. Калеснік У. Фантазмы Ігната Канчэўскага. У: Калеснік У. *Зорны спеў: літаратурныя партрэты, нарысы, эцюды.* Мінск: Мастацкая літаратура; 1975. 398 с.
5. Давыдов НВ, составитель. *Проект общих положений Народного университета и Объяснительная к нему записка.* Москва: Городская типография; 1918. 24 с.
6. Власов ВА. Народный университет имени Шанявского. *Известия Пензенского государственного педагогического университета им. В. Г. Белинского.* 2012;27:527–532.
7. Harrison M. Chayanov and the Economics of the Russian Peasantry. *The Journal of Peasant Studies.* 1975;2(4):389–417.
8. Bernstein H. V. I. Lenin and A. V. Chayanov: looking back, looking forward. *The Journal of Peasant Studies.* 2009;36(1): 55–81.
9. Lehmann D. After Chayanov and Lenin: new paths of agrarian capitalism. *Journal of Development Economics.* 1982;11(2):133–161.
10. Shanin T. Chayanov message: Illuminations, miscomprehensions and the contemporary «Development theory». In: Chayanov AV. *The Theory of Peasant Economy.* Madison: The University of Wisconsin Press; 1986. p. 1–24.
11. Shanin T. Chayanov's treble death and tenuous resurrection: an essay about understanding, about roots of plausibility and about rural Russia. *The Journal of Peasant Studies.* 2009;36(1):83–101.
12. Бяляцкі А. «Усё жыццё жыць хацеў я з людзьмі…». *Спадчына.* 1990;2:21–24.
13. Басюк І. Грамадска-палітычныя і прававыя погляды Ігната Абдзіраловіча (Канчэўскага). *Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 4: Правазнаўства.* 2009;3:23–29.
14. Ляхоўскі У, Чарнякевіч А. Кузьма Цярэшчанка: acta non verba. *Arche.* 2011;11(110):22–64.
15. Конан У. У свабодзе і творчасці – ратунак для свету. У: Дубавец У, укладальнік. *Вобраз-90: літаратурна-крытычныя артыкулы.* Мінск: Мастацкая літаратура; 1990. с. 33–42.
16. Быстрык А. Віленскі перыяд жыцця і дзейнасці Ігната Канчэўскага (1919–1923). В: Миненков ГЯ, редактор. *Европа – 2011: глобальное и локальное: материалы Международной научной конференции студентов; 13–15 мая 2011 г.; Вильнюс, Литва.* Вильнюс: Европейский гуманитарный университет; 2012. с. 33–41.
17. Геніюш ЛА. *Споведзь.* Мінск: Мастацкая літаратура; 1993. 271 с.
18. Савіч А. Арсень Канчэўскі: жыццёвы шлях і палітычная кар'ера. *Acta Albaruthenica.* 2015;15:183–192.
19. Туронак Ю. *Вацлаў Іваноўскі і адраджэнне Беларусі.* Мінск: Мэдысонт; 2006. 178 с.
20. Орехво НС. *Дела и люди КПЗБ: воспоминания.* Минск: Беларусь; 1983. 296 с.
21. Ганна Галубянка [Канчэўскі ІУ]. На матывы Р. Тагора. *Наша будучына.* 1923;1:2.
22. ІА. [Канчэўскі ІУ]. Бібліягрáфія. Л. Родзевіч. Беларусь. Вільня. 1922. Друкарня «Друк». Субач 2. *Наша Будучына.* 1923;1:3–4.
23. Канчэўскі І. Вершы зь Віленскага архіву [Інтэрнэт; працытавана 30 красавіка 2019 г.]. Даступна па: https://nn.by?c=ar&i=93041.
24. Канчэўскі І. Эскізы будычыні. *Аддзел рукапісаў бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.* Фонд 23. Вопіс 1. Справа 25.
25. Канчэўскі І. Накідкі думак аб выкладанні ў школе асноў кааперацыі. *Аддзел рукапісаў бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Фонд 23. Вопіс 1. Справа 26.*
26. Канчэўскі І. Пісьмо у Рэдакцыю. *Наша думка.* 1921;19:5.
27. Дубавец С. Прадмова. У: Абдзіраловіч І. *Адвечным шляхам. Дасьледзіны беларускага сьветагляду.* Мінск: Навука і тэхніка; 1993. с. 3–4.
28. Абдзіраловіч І. [Канчэўскі ІУ]. Адвечным шляхам. (Досьлед беларускага сьветагляду). *Наша думка.* 1921;22:2–3.
29. Ігнат Абдзіраловіч. Адвечным шляхам. (Досьлед беларускага сьветагляду). *Наша думка.* 1921;23:2–3.
30. Ігнат Абдзіраловіч. Адвечным шляхам. (Досьлед беларускага сьветагляду). *Наша думка.* 1921;24:2–4.
31. Ігнат Абдзіраловіч. Адвечным шляхам. (Досьлед беларускага сьветагляду). *Наша думка.* 1921;25:2–3.
32. Ігнат Абдзіраловіч. Адвечным шляхам. (Досьлед беларускага сьветагляду). *Наша думка.* 1921;26:2–3.
33. Ігнат Абдзіраловіч. Адвечным шляхам. (Досьлед беларускага сьветагляду). *Наша думка.* 1921;27:2–4.
34. Абдзіраловіч І. [Канчэўскі ІУ.]. П.П.С. і «unarodowienie» польскага гандлю. *Беларускія ведамасьці.* 1921;14:2.
35. ІА. [Канчэўскі ІУ]. Ратуйце коопэрацыю! *Беларускі звон.* 1922;23(48):2–3.
36. ІА. [Канчэўскі ІУ]. Бібліографія. *Беларускі звон.* 1922;32(57):3–4.
37. ІА. [Канчэўскі ІУ]. Пашырэньне коопэратыўнага закону на Віленшчыну. *Беларускі звон.* 1922;33(58):2.
38. ІА. [Канчэўскі ІУ]. Крэдытовая коопэрацыя. *Наша будучына.* 1922;1:2.

39. IA. [Канчэўскі ІУ]. На коопэратыўныя тэмы. *Наша будучына.* 1922;2:2.
40. IK. [Канчэўскі ІУ]. Коопэрацыя ў 1922 годзе. *Наша будучына.* 1922;3:1–2.
41. Ганна Галубянка [Канчэўскі ІУ]. Gloria – Слава у вышніх (З. З. Войнароўскай). *Наша будучына.* 1922;3:4.
42. Ганна Галубянка [Канчэўскі ІУ]. Верасьнёвае панно. *Наша будучына.* 1923;4:2.
43. Ганна Галубянка [Канчэўскі ІУ]. У сьвяточны дзень. *Новае жыцьцё.* 1923;1:2.
44. Канчэўскі І. Закладайма народныя выдавецтва! *Наша будучына.* 1923;3:3.
45. Канчэўскі І. Мы разам… (з пасьмертнае спадчыны). У: *Заходняя Беларусь: зборнік грамадзкае мысьлі, навукі, літэратуры, мастацтва Зах. Беларусі.* Вільня: Беларускае выдавецкае таварыства; 1923.
46. Канчэўскі І. З мінуушчыны коопэрацыі у Віленшчыне. У: *Заходняя Беларусь: зборнік грамадзкае мысьлі, навукі, літэратуры, мастацтва Зах. Беларусі.* Вільня: Беларускае выдавецкае таварыства; 1923.

## References

1. Abdziralovich I. [Kanchjewski IU]. *Advechnym shljaham. Das'ledziny belaruskaga s'vetagljadu* [Eternal way (Study of the Belarusian world view)]. Minsk: Navuka i tjehnika; 1993. 44 p. Belarusian.
2. AL. [Luckievich A.]. [In memory of Ignat Kanchewski]. *Novae zhyccjo*. 1923;9:1. Belarusian.
3. Kalesnik UA. *Vetrazi Adyseja: Uladzimir Zhylka i ramantychnaja tradycyja w belaruskaj pajezii* [Uladzimir Zhylka and romantic tradition in the Belarusian poetry]. Minsk: Mastackaja litaratura; 1977. 325 p. Belarusian.
4. Kalesnik U. [Phantasms of Ignat Kanchewski]. In: Kalesnik U. *Zorny spew: litaraturnyja partrjety, narysy, jecjudy* [Star songs: literary portraits, essays, sketches]. Minsk: Mastackaja litaratura; 1975. 398 p. Belarusian.
5. Davydov NV, compiler. *Proekt obshchikh polozhenii Narodnogo universiteta i Ob'yasnitel'naya k nemu zapiska* [Draft of general provisions for the National University and the Explanatory Note to it]. Moscow: Gorodskaya tipografiya; 1918. 24 p. Russian.
6. Vlasov VA. Shanyavsky People's University. *Izvestiya Penzenskogo gosudarstvennogo pedagogicheskogo universiteta im. V. G. Belinskogo*. 2012;27:527–532. Russian.
7. Harrison M. Chayanov and the Economics of the Russian Peasantry. *The Journal of Peasant Studies*. 1975;2(4):389–417.
8. Bernstein H. V. I. Lenin and A. V. Chayanov: looking back, looking forward. *The Journal of Peasant Studies.* 2009;36(1): 55–81.
9. Lehmann D. After Chayanov and Lenin: new paths of agrarian capitalism. *Journal of Development Economics.* 1982; 11(2):133–161.
10. Shanin T. Chayanov message: Illuminations, miscomprehensions and the contemporary «Development theory». In: Chayanov AV. *The Theory of Peasant Economy*. The University of Wisconsin Press; 1986. p. 1–24.
11. Shanin T. Chayanov's treble death and tenuous resurrection: an essay about understanding, about roots of plausibility and about rural Russia. *The Journal of Peasant Studies*. 2009;36(1):83–101.
12. Bjaljacki A. [«All my life I wanted to live with people…»]. *Spadchyna*. 1990;2:21–24. Belarusian.
13. Basjuk I. [Socio-political and legal views of Ignat Abdziralovich (Kanchewski)]. *Vestnik of Yanka Kupala State University of Grodno. Series 4: Jurisprudence.* 2009;3:23–29. Belarusian.
14. Ljachowski U, Charnjakevich A. [Kuz'ma Cjareshchanka: acta non verba]. *Arche*. 2011;11:22–64. Belarusian.
15. Conan U. [The salvation of the world in freedom and creativity]. In: Dubavec U, compiler. *Vobraz-90: litaraturna-krytychnyja artykuly* [The image of the 90: the literary-critical articles]. Minsk: Mastackaja litaratura; 1990. p. 33–42. Belarusian.
16. Bystryk A. [Vilnius period of life and work of Ignat Kanchewski]. In: Minenkov GYa, editor. *Evropa – 2011: global'noe i lokal'noe: materialy Mezhdunarodnoi nauchnoi konferentsii studentov; 13–15 maya 2011 g.; Vil'nyus, Litva* [Europe – 2011: global and local: materials of the International scientific conference of students; 2011 May 13–15; Vilnius, Lithuania]. Vilnius: European Humanities University; 2012. p. 33–41. Belarusian.
17. Genijush LA. *Spovedz'* [Confession]. Minsk: Mastackaja litaratura; 1993. 271 p. Belarusian.
18. Savich A. Arseny Konchevsky: His Life and Political Career. *Acta Albaruthenica*. 2015;15:183–192. Belarusian.
19. Turonak Ju. *Vaclaw Ivanowski i adradzhjenne Belarusi* [Vaclaw Ivanowski and the revival of Belarus]. Minsk: Medysont; 2006. 178 p. Belarusian.
20. Orekhvo NS. *Dela i lyudi KPZB: vospominaniya* [Cases and people of the Communist Party of Western Belarus: memories]. Minsk: Belarus; 1983. 296 p. Russian.
21. Ganna Galubjanka [Kanchewski IU]. [On the motives of R. Tagore]. *Nasha buduchyna*. 1923;1:2. Belarusian.
22. IA. [Kanchewski IU]. [Bibliography. L. Rodzevich. Belarus. Vilnius. 1922. Typography «Print». Suboch 2]. *Nasha buduchyna*. 1923;1:3–4. Belarusian.
23. Kanchewski I. *Vershy z' Vilenskaga arhivu*. [Internet; cited 2019 April 30]. Available from: https://nn.by?c=ar&i=93041.
24. Kanchewski I. [Sketches of the future]. *Department of Manuscripts of the National Academy of Sciences Library.* Fund 23. Registed 1. File 25. Belarusian.
25. Kanchewski I. [Sketch of ideas about teaching in the school of basis of cooperation]. *Department of Manuscripts of the National Academy of Sciences Library.* Fund 23. Register 1. File 26. Belarusian.
26. Kanchewski I. [Letter to the Editors]. *Nasha dumka*. 1921;19:5. Belarusian.
27. Dubavec S. [Preference]. In: Abdziralovich I. *Advechnym shljaham. Das'ledziny belaruskaga s'vetagljadu* [Eternal way (Study of the Belarusian world view)]. Minsk: Navuka i tjehnika; 1993. p. 3–4. Belarusian.
28. Abdziralovich I. [Kanchewski IV]. [Eternal way. (Study of the Belarusian worldview)]. *Nasha dumka*. 1921;22:2–3. Belarusian.
29. Ignat Abdziralovich. [Eternal way. (Study of the Belarusian worldview)]. *Nasha dumka*. 1921;23:2–3. Belarusian.
30. Ignat Abdziralovich. [Eternal way. (Study of the Belarusian worldview)]. *Nasha dumka*. 1921;24:2–4. Belarusian.
31. Ignat Abdziralovich. [Eternal way. (Study of the Belarusian worldview)]. *Nasha dumka*. 1921;25:2–3. Belarusian.
32. Ignat Abdziralovich. [Eternal way. (Study of the Belarusian worldview)]. *Nasha dumka*. 1921;26:2–3. Belarusian.
33. Ignat Abdziralovich. [Eternal way. (Study of the Belarusian worldview)]. *Nasha dumka*. 1921;27:2–4. Belarusian.
34. Abdziralovich I. [Kanchewski IU]. [The Polish Socialist Party and «unarodowienie» of Polish trade]. *Belaruskija vedamas'ci*. 1921;14:2. Belarusian.

35. IA. [Kanchewski IU]. [Save cooperation!]. *Belaruski zvon*. 1922;23(48):2–3. Belarusian.
36. IA. [Kanchewski IU]. [Bibliography]. *Belaruski zvon*. 1922;32(57):3–4. Belarusian.
37. IA. [Kanchewski IU]. [Expanding cooperative law in the Vilnius region]. *Belaruski zvon*. 1922;33(58):2. Belarusian.
38. IA. [Kanchewski IU]. [Credit cooperation]. *Nasha buduchyna*. 1922;1:2. Belarusian.
39. IA. [Kanchewski IU]. [On cooperative topics]. *Nasha buduchyna*. 1922;2:2. Belarusian.
40. IK. [Kanchewski IU]. [Cooperation in 1922]. *Nasha buduchyna.* 1922;3:1–2. Belarusian.
41. Ganna Galubjanka [Kanchewski IU]. [Gloria – Glory in the highest (Z. Z. Vojnarowskai)]. *Nasha buduchyna.* 1922;3:4. Belarusian.
42. Ganna Galubjanka [Kanchewski IU]. [September mural]. *Nasha buduchyna*. 1923;4:2. Belarusian.
43. Ganna Galubjanka [Kanchewski IU]. [In festive day]. *Novae Zhyccjo.* 1923;1:2. Belarusian.
44. Kanchewski I. [Let's establish the People's Publishing House!]. *Nasha buduchyna*. 1923;3:3. Belarusian.
45. Kanchewski I. [We are together… (from the posthumous heritage)]. In: *Zahodnjaja Belarus': zbornik gramadzkae mys'li, navuki, litjeratury, mastactva Zah. Belarusi* [Western Belarus: the collection of public thought, science, literature, art of Western Belarus]. Vilnius: Belaruskae vydaveckae tavarystva; 1923. Belarusian.
46. Kanchewski I. [From the past of cooperation in the Vilnius region]. In: *Zahodnjaja Belarus': zbornik gramadzkae mys'li, navuki, litjeratury, mastactva Zah. Belarusi* [Western Belarus: the collection of public thought, science, literature, art of Western Belarus]. Vilnius: Belaruskae vydaveckae tavarystva; 1923. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 02.11.2018.*
*Received by editorial board 02.11.2018.*